ЗАЦВЯРДЖАЮ
Старшыня
Брэсцкага гарадскога выканаўчага
камітэта
_____________ С.М. Лабадзінскі

«19» ___09_____ 2023

ПАЛАЖЭННЕ
аб правядзенні першага
літаратурна-мастацкага конкурсу
“Прыгожыя старонкі”

## 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1.1. Сапраўднае Палажэнне вызначае парадак правядзення літаратурна-мастацкага конкурсу “Прыгожыя старонкі”.

1.1.2. Літаратурна-мастацкі конкурс “Прыгожыя старонкі” (далей – Конкурс) праводзіцца сярод дзяцей і моладзі.

1.1.2.1. Конкурс праводзіцца ў мэтах рэалізацыі дзяржаўнай праграмы “Культура Беларусі” 2021-2025 гг.

1.1.2.2. Арганізатарамі конкурсу з'яўляюцца аддзел культуры Брэсцкага гарадскога выканаўчага камітэта, ДУДА “Дзіцячая школа выяўленчых мастацтваў імя А. А. Алонцава г. Брэста”, ДУК “Брэсцкая ЦГБ імя А. С. Пушкіна”, дзіцячы аўтар Міхаіл Валер'евіч Туруноўскі.

## 2. МЭТЫ І ЗАДАЧЫ

2.1.1. Пошук і падтрымка таленавітых дзяцей і моладзі ў літаратурным і мастацка-выяўленчым асяроддзі, прадастаўленне ім магчымасці творчых зносін са сваімі аднагодкамі, аб'яднаных агульнымі інтарэсамі.

2.1.1.1. Заахвочванне дзяцей і моладзі да самаразвіцця і самавыяўлення.

2.1.1.2. Прадастаўленне магчымасцей для творчасці і публікацыі.

2.1.1.3. Прыцягненне ўвагі грамадскасці да літаратурнага і мастацка-выяўленчага мастацтва.

2.1.1.4. Прыцягненне магчыма большай колькасці дзяцей і моладзі да актыўнай інтэлектуальнай дзейнасці, змястоўнага адпачынку.

2.1.1.5. Заахвочванне асобаснай самабытнасці.

2.1.1.6. Эстэтычнае выхаванне.

2.1.1.7. Уцягванне ў заняткі літаратурнай і мастацкай творчасцю.

## 3. УДЗЕЛЬНІКІ КОНКУРСУ

3.1. Да ўдзелу ў конкурсе прымаюцца творы аўтараў у трох узроставых катэгорыях:

ад 7 да 10 годоў,

ад 11 да 15 годоў,

ад 16 да 30 годоў.

## 4. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў КОНКУРСЕ

4.1.1.1. Тэматыка конкурсных работ свабодная і павінна адпавядаць агульнапрынятым канонам дзіцячай літаратуры. Забараняюцца творы якія змяшчаюць сцэны насілля і якія прапагандуюць антысацыяльныя паводзіны.

4.1.1.2. Конкурс праводзіцца па намінацыях:

"Малая проза" (апавяданне, казка),

"Паэзія" (вершы).

4.1.1.3. Адзін аўтар можа прадставіць не больш за два творы ў кожнай намінацыі.

4.1.2. Конкурсныя работы прымаюцца на рускай і беларускай мовах.

## 5. ПАТРАБАВАННІ, ЯКІЯ ПРАД'ЯЎЛЯЮЦЦА ДА ТВОРЧЫХ РАБОТ

5.1.1.1. Да творчых работ прыкладаецца заяўка на ўдзел у Конкурсе згодна з Дадаткам да гэтага Палажэння.

5.1.1.2. Прадастаўленне работы на Конкурс, падача заяўкі з'яўляецца згодай аўтара працы і яго законнага прадстаўніка з умовамі Конкурсу і з правам арганізатараў на апрацоўку персанальных звестак.

5.1.1.3. Конкурсная заяўка з творчай работай накіроўваецца Арганізатару Конкурсу на адрас электроннай пошты ksk.brest@yandex.ru

5.1.1.4. Творчыя работы павінны быць афармлены ў электронным выглядзе (фармат ліста – А4, кегль – 12, шрыфт – Times New Roman, міжрадковы інтэрвал – 1,5, водступ абзаца – 1,25, аб'ём тэксту – не больш за 5 старонак).

5.1.1.5. Не дапускаецца прадастаўленне на Конкурс наступных творчых работ:

5.1.1.6. Раней апублікаваных.

5.1.1.7. Чужых работ.

5.1.1.8. Работ з парушэннем патрабаванняў да афармлення.

5.1.1.9. Работ з граматычнымі, арфаграфічнымі памылкамі.

5.1.1.10. Работ, якія змяшчаюць прапаганду асацыяльных паводзін, насілля, рэлігійнай і нацыянальнай варожасці.

5.1.1.11. Творчыя працы, якія не адпавядаюць гэтым патрабаванням, да разгляду не прымаюцца.

5.1.1.12. Творчыя работы, якія паступілі на Конкурс, не рэцэнзуюцца і аўтарам не вяртаюцца.

## 6. ЧАС ПРАВЯДЗЕННЯ І ЭТАПЫ КОНКУРСУ

6.1.1.1. Конкурсныя работы прымаюцца з 01 кастрычніка да 30 лістапада 2023 года ў выглядзе электроннага дакумента ў фармаце doc. docx. Кожны твор размяшчаецца ў асобным файле.

6.1.1.2. З 01 снежня па 31 снежня 2023 года праходзіць конкурсны адбор работ членамі журы Конкурсу з наступнай перадачай тэкстаў пераможцаў у ДУДА "Дзіцячая школа выяўленчых мастацтваў імя А. А. Алонцава г. Брэста".

6.1.1.3. З 15 студзеня па 15 красавіка 2024 года праводзіцца работа над стварэннем ілюстрацый да твораў пераможцаў літаратурнай часткі Конкурсу. Імёны ілюстратараў выяўляюцца шляхам унутрышкольнага конкурснага адбору.

6.1.1.4. Работы пераможцаў і фіналістаў конкурсу будуць уключаны ў альманах "Прыгожыя старонкі", які будзе выдадзены пры падтрымцы Брэсцкага гарвыканкама.

6.1.1.5. Падвядзенне вынікаў конкурсу з прэзентацыяй літаратурна-мастацкага альманаха адбудзецца на літаратурна-музычным свяце, прысвечаным Дню абароны дзяцей 01 чэрвеня 2024 года.

## 7. ЖУРЫ КОНКУРСУ

7.1.1.1. Вынікі Конкурсу падводзіць спецыяльна створанае журы.

7.1.1.2. Склад журы Конкурсу вызначаецца Арганізатарамі конкурсу. У склад журы конкурсу ўваходзяць прадстаўнікі пісьменніцкай і педагагічнай супольнасці, прадстаўнікі Конкурсу ад Арганізатараў, прадстаўнікі партнёраў і спонсараў.

7.1.1.3. Журы конкурсу выбірае пераможцаў конкурсу.

7.1.1.4. Выяўленне пераможцаў Конкурсу адбываецца шляхам тайнага галасавання без указання членам журы імёнаў аўтараў, якія прадставілі на Конкурс свае работы.

7.1.1.5. Усе пераможцы Конкурсу атрымліваюць бясплатнае права публікацыі ў літаратурна-мастацкім альманаху, а таксама памятныя экзэмпляры альманаха і дыпломы лаўрэатаў конкурсу.

## 8. АЎТАРСКІЯ ПРАВЫ І ДАЛЕЙШАЕ ВЫКАРЫСТАННЕ КОНКУРСНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ

8.1.1.1. Аўтарскія правы застаюцца за канкурсантамі.

8.1.1.2. Арганізатар Конкурсу пакідае за сабой права выкарыстоўваць творчыя працы для асвятлення Конкурсу, выданне конкурснага альманаха і размяшчэнне на сайце ДУК “Брэсцкая ЦГБ імя А.С. Пушкіна” gcbs-brest.by

Намеснік старшыні Брэсцкага
гарадскога выканаўчага камітэта В.К.Шчэрба

С.Н. Семашко

Дадатак

# ЗАЯЎКА
# НА ЎДЗЕЛ У ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІМ КОНКУРСЕ «ПРЫГОЖЫЯ СТАРОНКІ»

| | |
|---|---|
| Прозвішча, імя, імя па бацьку ўдзельніка | |
| Поўная дата нарадджэння, узрост | |
| Месца вучобы ці працы | |
| Тэлефон удзельніка (хатні, працоўны, мабільны) з указаннем міжгародняга кода населенага пункта | |
| Адрас электроннай пошты для сувязі | |
| Хатні адрас | |
| Намінацыя Конкурсу | |
| Назва конкурснай работы | |